Проект начинается с изучения цветов и форм, двигаясь от простых концепции к более сложным, далее происходит овладение знаниями цифр и букв, элементарных навыков чтения и счёта, развитие памяти, внимания, мышления и так далее.

Приведённые выше каналы являются лишь малой частью того многообразия, которое предоставлено в приложении YouTube Kids. Каждый автор создает приятный глазу, оригинальный, созидательный контент, но тем не менее их объединяет одна главная цель – обеспечить как можно более благоприятное, комфортное развитие ребенка посредством просмотра обучающих видеороликов [5].

**Заключение.** В этой связи можно сделать вывод, что мобильное приложение YouTube Kids на своём современном этапе имеет богатую психолого-педагогическую основу содержания видеороликов, которые, безусловно, обеспечивают положительное воздействие на психику ребенка, его общее физиологическое состояние.

Несмотря на конструктивную содержательную платформы, следует помнить о том, что обучение ребенка только посредством видеоматериала не может раскрыть в полной мере всех заложенных изначально задатков. Требуется непосредственное участие взрослого в жизни ребенка.

Список цитированных источников:


1. Официальный сайт YouTube [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://www.youtube.com/intl/ALL_ru/howyoutubeworks/ – Дата доступа: 11.02.2022.
2. Разница между режимом родительского контроля на YouTube и приложением «YouTube Детям» [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://support.google.com/youtubekids/answer/10315420. – Дата доступа: 11.02.2022.
3. DIGITAL 2022: GLOBAL OVERVIEW REPORT [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://datareportal.com/reports/digital-2022-global-overview-report. – Дата доступа: 11.02.2022.
4. Рейтинг топ веб-сайтов [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://www.similarweb.com/ru/top-websites/russian-federation/ – Дата доступа: 11.02.2022.
5. YouTube Kids [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://www.youtubekids.com/ – Дата доступа: 11.02.2022.



**К.А. СІМАНЮК**
Рэспубліка Беларусь, Брэст, БрДУ імя А.С. Пушкіна


## РАЗВІЦЦЁ ВУСНАГА ЗВЯЗНАГА МАЎЛЕННЯ МАЛОДШЫХ ШКОЛЬНІКАЎ НА ЎРОКАХ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ ПРАЗ ПРАЦУ З ТЭКСТАМ

**Уводзіны.** Развіццё звязнага маўлення малодшых школьнікаў – адна з самых актуальных праблем выкладання беларускай мовы на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі. Паводле М.Р. Львова, “пад звязным маўленнем разумеецца маўленне, якое арганізавана па законах логікі і граматыкі, уяўляе сабой адзінае цэлае, мае тэму, валодае адноснай самастойнасцю, закончанасцю і расчляняецца на больш ці менш значныя часткі, звязаныя паміж сабою” [1, с. 230]. Т.А. Ладыжанская разглядае звязнае маўленне як від маўленчай дзейнасці, вынікам якой з’яўляецца тэкставае паведамленне [2].

Навучанне завязнаму маўленню можна разглядаць і як мэту, і як сродак практычнага авалодання мовай. Асваенне розных бакоў маўлення з’яўляецца неабходнай умовай развіцця звязнага маўлення, і ў той жа час развіццё звязнага маўлення садзейнічае самастойнаму выкарыстанню вучнем асобных слоў і сітаксічных канструкцый. Звязнае маўленне ўключае ў сябе ўсе дасягненні вучня ў авалоданні роднай мовай, яе гукавым ладам, слоўнікавым складам, граматычным ладам.

**Мэта** працы – выявіць найбольш эфектыўныя прыёмы працы з тэкстам, якія спрыяюць развіццю вуснага звязнага маўлення вучняў пачатковых класаў.

Тэкст – гэта не толькі прадукт, але і вобраз, і аб’ект дзейнасці зносін. Працэс стварэння або інтэрпрэтацыі тэксту ўяўляе сабой не нешта першапачаткова зададзенае, а кожны раз творчае ўз’яднанне ўсіх названых аперацый, у выніку чаго ўзнікаюць і зноў фарміруюцца думкі, здагадкі, вывады, абагульненні. Пры развіцці звязнага вуснага маўлення неабходна выкарыстоўваць узорныя тэксты, аналіз і засваенне якіх будзе спрыяць удасканаленню маўлення вучняў. Да ўрокаў трэба падбіраць такія тэксты, якія б дазволілі малодшым школьнікам “вучыцца гаварыць, вучыцца думаць і адчуваць”.

Наша дaследаванне праводзіася на базе ДУА "ВПК дзіцячы сад – пачатковая школа № 5 г. Брэста". У даследаванні ўдзельнічалі вучні 4 класаў. Метады даследавання – назіранне, апісанне.

З'яўляючыся асноўным кампанентам структуры падручніка, тэкст рэалізуе арганізуючую, інфарматыўную і выхаваўчую функцыі. Акрамя гэтага, у падручніках тэксты дэманструюць выкарыстанне моўных адзінак розных узроўняў (тэксты-дэманстратары) і служаць эталонам рэальных маўленчых паводзін (тэксты-ўзоры).

З мэтай фарміравання ў вучняў умення сістэматызаваць, рэдагаваць, выкарыстоўваць неабходныя моўныя сродкі ў працэсе стварэння тэксту выкарыстоўваюцца наступныя віды практыкаванняў:

1. Узнаўленне ў тэксце апушчаных элементаў – слоў, словазлучэнняў, апісальных выразаў.

2. Падбор сінонімаў да пэўных элементаў тэксту з мэтай пазбягання паўтораў, захавання стылістычнай афарбоўкі, больш дакладнай перадачы зместу; выдзяленне апорных слоў; складанне тэксту з частак.

3. Праца з дэфармаваным тэкстам.

4. Рэдагаванне тэксту з дапамогай памяткі «Рэдактар» (правер, ці зразумелая тэма, ці ясная галоўная думка, ці перадае тэму і галоўную думку назва тэксту, ці выдзелены часткі тэксту, ці рухаецца думка ад сказа да сказа, ці не парушаны парадак частак, ці ўдалыя пачатак і канцоўка тэксту, ці правільна, дакладна выражаны думкі).

Каб навучыць малодшых школьнікаў рэдагаваць тэксты з пункту погляду іх зместу, лексікі і граматыкі, выкарыстоўваюцца практыкаванні на складанне тэксту з прапанаваных сказаў і гатовых частак тэксту (сказы і часткі тэксту даюцца не паслядоўна, а ў "рассыпаным" выглядзе). Карысныя таксама заданні на дапаўненне тэксту адсутнымі часткамі, а таксама на выключэнне з тэксту частак, якія не адпавядаюць яго тэме і жанру. З мэтай развіцця ўмення прагназаваць выказванне прапануюцца практыкаванні, заснаваныя на трансфармацыі тэксту: працяг тэксту; прагназаванне зместу і кампазіцыі тэксту па назве (загалоўку), па пачатку, па анатацыі і г.д.

З мэтай развіцця ўменняў арфаэпічна, граматычна і фанетычна правільна будаваць звязнае выказванне прапануюцца наступныя віды заданняў: знайдзіце маўленчыя памылкі і выпраўце іх; выпраўце памылкі, дапушчаныя ў вымаўленні слоў; вымаўце тэкст весела (сумна, урачыста, са здзіўленнем) і інш.

На ўроках неабходна надаваць асаблівую ўвагу планаванню кампазіцыі тэксту. Неабходна вучыць дзяцей вызначаць асноўную думку тэксту, вылучаць уступную частку, абдумваць вынікі. Навучыць школьнікаў пераказваць і складаць тэксты дапамагаюць актыўныя формы навучання, дзе павялічана ступень самастойнасці вучняў і развіваюцца творчыя здольнасці кожнага дзіцяці.

Адным з асноўных прыёмаў фарміравання ў вучняў пачатковых класаў умення вылучаць галоўную думку перад складаннем уласных тэкстаў з'яўляецца аналіз прыказак, праца з якімі не толькі развівае маўленчыя ўменні вучняў, але і спрыяе іх інтэлектуальнаму росту.

Малодшым школьнікам вельмі падабаецца разгадваць загадкі. Працу над тэкстамі загадак можна будаваць наступным чынам: спачатку вывучаюцца і аналізуюцца народныя загадкі, затым – аўтарскія, праводзіцца іх параўнанне. Вучні прыходзяць да вываду, што менавіта апісанне дапамагае разгадаць і скласці загадку. Спачатку загадкі складаюцца калектыўна, затым у групах і індывідуальна.

Складанне казак – яшчэ адзін этап у развіцці звязнага вуснага маўлення вучняў, іх уяўлення, назіральнасці, мыслення. Для развіцця вуснага звязнага маўлення дзяцей выкарыстоўваецца такі метадычны прыём, як інтэрпрэтацыя казкі. Інтэрпрэтуючы твор, кожны вучань мае магчымасць творча праявіць сябе, выступаючы ў новай ролі. Прывядзём прыклады некаторых заданняў: раскажыце сюжэт вядомай казкі ад імя персанажаў або прадметаў – "удзельнікаў падзей"; "Што было далей?" (закончыце сюжэт твора); раскажыце казку так, каб героі сталі антыгероямі (прагны – шчодрым, злы – добрым, і г.д.); спрагназуйце далейшае развіццё падзей у творы (вучні слухаюць твор, на пэўным этапе развіцця сюжэта чытанне перапыняецца і настаўнік задае пытанне аб тым, як варта паступіць герою ў складанай сітуацыі); перастаўце персанажаў унутры адной казкі; уключыце ў сюжэт казкі дадатковых персанажаў.

Школьная практыка сведчыць, што вельмі эфектыўнымі творчымі практыкаваннямі для развіцця звязнага маўлення вучняў з'яўляюцца "Салата з казак", "Канструяванне загадак", "Біном фантазіі", "Перакладчык" (замяніце іншамоўнае слова беларускім).

З мэтай далучэння вучняў да творчага працэсу складання ўласных тэкстаў на ўроках выкарыстоўваюцца такія прыёмы, як "Я пачну, а ты працягні ...", "Я адчуваю, што я ..." (аповед-

фантазія), "Слова-магніт", сачыненні-мініяцюры на свабодную тэму, "Язык заплятаецца" (словы-паразіты ў маім жыцці). Сістэматычная праца на ўроках беларускай мовы над тэкстам садзейнічае фарміраванню ў вучняў станоўчай матывацыі да вывучэння беларускай мовы, павышэнню ўзроўню вуснага звязнага маўлення малодшых школьнікаў.

З мэтай дыягностыкі звязнага вуснага маўлення мы выкарысталі методыку Т.В. Ахуцінай і Т.А. Фоцекавай [3]. Вынікі дыягностыкі паказалі, што высокім узроўнем магчымасці пабудовы тэксту авалодалі 27% вучняў (было – 11%), сярэднім – 64% (было – 42%), значна зменшылася колькасць вучняў з нізкім узроўнем – 9% (было – 47%). Графічна правільным афармленнем тэксту авалодалі на высокім узроўні 39% (было 12%), сярэднім – 51% (было 33%), нізкім – 10% (55%).

**Заключэнне.** Сістэматычная і мэтанакіраваная праца па развіцці звязнага маўлення спрыяе фарміраванню ў вучняў пачуцця мовы, патрэбы карыстацца моўным багаццем, удасканальваць вуснае і пісьмовае маўленне:

Малодшыя школьнікі паступова пачалі праяўляць ўсё больш высокую ступень самастойнасці, навучыліся задаваць пытанні, знаходзіць на іх адказы, рабіць аналіз прачытанага тэксту, разумець чужыя думкі, занатаваныя ў тэксце, прыслухоўвацца да чужога меркавання і выказваць сваё, прадстаўляць карціны, намаляваныя аўтарам, дапаўняць іх, адчуваць настрой аўтара, знаходзіць для яго перадачы патрэбныя словы і інтанацыю.


Спіс цытаваных крыніц:

1. Львов, М.Р. Методика развития речи младших школьников: пособие / М.Р. Львов. – М.: Астрель., 2003. – 238 с.
2. Ладыженская, Т.А. Система работы по развитию связной устной речи учащихся. – М.: Пелагоника, 1975. – 255 с.
3. Фотекова, Т.А. Тестовая методика диагностики устной речи младших школьников: монография / Т.В. Ахутина, Т.А. Фотекова. – М.: Аркти, 2000. – 214 с.



**К.С. СКАЧКО**

Республика Беларусь, Минск, БГПУ имени Максима Танка


## СПЕЦИФИКА ИСПОЛЬЗОВАНИЯ МЕТОДА ПРОЕКТОВ В РАБОТЕ С ДЕТЬМИ СТАРШЕГО ДОШКОЛЬНОГО ВОЗРАСТА

**Введение.** В педагогической науке и практике все больше возрастает интерес к использованию метода проектов, поскольку он ориентирован на гуманистические субъект-субъектные отношения и продуктивную деятельность участников образовательного процесса, что соответствует требованиям современности.

На протяжении десятилетий метод проектов не был востребован, его «второе рождение» в начале 90-х гг. XX в. произошло первоначально в практике, а затем получило теоретическое обоснование в зарубежной и отечественной педагогике. Так, проведенные исследования касались раскрытия сущности метода проектов, его проблемного характера, места в образовании детей дошкольного возраста (Н.Е. Веракса [1], Н.А. Виноградова [2], Л.Д. Морозова [3], А.А. Петрикевич [4], И.В. Штанько [5] и др.).

Метод проектов в образовании детей дошкольного возраста представляет собой организацию процесса обучения, при котором воспитанники приобретают знания и умения, эмоционально-ценностное отношение к действительности, опыт в процессе планирования, выполнения практических заданий и представления результатов совей деятельности. В основе метода проектов лежит стимулирование интереса воспитанников к определенным проблемам, решение которых предусматривает использование интегрированного подхода. Интегративный характер проекта позволяет включать в него разнообразные формы и методы работы с воспитанниками, актуализировать знания и умения, полученные ребенком в разных областях познания, что способствует целостности восприятия картины мира. Это делает метод проектов значимым в решении как образовательных, так и воспитательных задач.

Наиболее изученными и представленными в теории и практике дошкольного образования являются экологические проекты и проекты, нацеленные на познание социальной действительности. Однако, несмотря на популярность и достаточно высокую эффективность метода проек-